2. Alpaugh, P. K., Parham, I. A., Cole, K. D., & Birren, J. E. (1982). Creativity in adulthood and old age: an exploratory study. Educational Gerontology, 8(2), 101–116. doi:10.1080/0380127820080202

3. Любарт, Т. Психология креативности. –М.: Когито-центр, 2009. – 214 с.

4. Муширу, К., Любарт, Т. Творческий процесс // Психология. – 2005. – № 4. – С. 74–80.

УДК004.7:378.147

К. Т. Тарасевіч, выкладчык-стажор, маг. філал. навук
(БГТУ, г. Минск)

## АДУКАЦЫЙНЫЯ ПЛАТФОРМЫ ЯК СРОДАК ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ І ПРАМОЦЫІ ЎНІВЕРСІТЭТА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЛЯЦОЎКІ FUTURELEARN)

Высакародная ідэя павышэння адукаванасці чалавека, незалежна ад яго ўзросту, нацыянальнасці, расы, фінансавага і грамадскага становішча паспрыяла развіццю вялікай колькасці адукацыйных платформ. Адной з іх з’яўляецца платформа Futurelearn. Яна прапаноўвае курсы рознага аб’ёму і працяглаcці ад вядомых ва ўсім свеце ўніверсітэтаў (TrinityCollegeDublin, UniversityofEastAnglia, etc.) у самых разнастайных сферах, разлічаныя не толькі і не столькі на спецыялістаў, што паглыбляюць свае веды, колькі на навічкоў, якіх зацікавіла тэма і якія хацелі б ведаць больш. Падаграваe і падтрымлівае гэтую цікаўнасць эрганамічны спосаб арганізацыі матэрыялаў: замест класічных лекцый і канспектаў вучням прапаноўваюцца невялікія артыкулы па тэме курса, цікавыя відэа, творчыя заданні і тэсты для самаправеркі. Увесь матэрыял скампанаваны паводле прынцыпаў сторытэлінгу. Ёсць некалькі блокаў (тыдняў), кожны з якіх “апавядае ўласную гісторыю” – максімальна раскрывае асобны аспект агульнай праблемы. У свой час кожная тэма падзяляецца на падтэмы, якія звяртаюць увагу на драбнейшыя дэталі. Спіс усіх частак курса сабраны ў асобным раздзеле; сістэма падсвечвае нумары параграфаў з ужо пройдзеным матэрыялам і запамінае, дзе карыстальнік спыніўся, што вельмі зручна ў адсочванні ўласнага прагрэсу. Важнай часткай навучальнага працэсу з’яўляецца дыскусія, да якой заклікаюць стваральнікі курсаў на розных этапах навучання, пакідаючы пытанні ці прапаноўваючы выказаць уласнае меркаванне ў каментарах. Куратары курса (прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта) таксама актыўна ўдзельнічаюць у навучальным працэсе, праз платформу

з імі можна нават скантактавацца наўпрост. Некаторыя курсы патрабуюць і асабістай сустрэчы “класа” – у такіх выпадках могуць арганізоўвацца вэбінары.

Звычайна кароткія бясплатныя курсы, не разлічаныя на атрыманне акадэмічнай ступені (бакалаўрскія і магістарскія праграмы, праграмы паслядыпломнай адукацыі звычайна платныя), доўжацца 4-6 тыдняў (платформа Futurelearn дае доступ да матэрыялаў цягам гэтага часу і наступных дадатковых двух тыдняў). З увагі на магчымую вялікую штодзённую загружанасць вучняў планаваны для азнаямлення з матэрыяламі час, прапісаны ва ўводзінах да курса, складае ў сярэднім 3 гадзіны на тыдзень. Вядома, для вартаснага занурвання ў праблематыку гэтага вельмі мала. Тым, хто хоча працягнуць даследаванні ў галіне самастойна, стваральнікі курсаў прапаноўваюць вялікую колькасць дадатковых спасылак на крыніцы і досыць грунтоўныя спісы літаратуры. Опцыя ж атрымання сертыфікату заканчэння курса і доступу да матэрыялаў праз увесь час іх існавання на платформе з’яўляецца платнай. Хоць варта адзначыць, што некаторыя ўніверсітэты падтрымліваюць міжнародныя адукацыйныя ініцыятывы розных арганізацый (як, напрыклад, BritishCouncil), якія даюць магчымасць студэнтам, у прыватнасці, з Беларусі, атрымаць неабмежаваны доступ да курса бясплатна пры ўмове паспяховага асвойвання пэўнай часткі запланаванай праграмы – гэты момант варта ўдакладняць у сістэме падчас рэгістрацыі на кожны курс.

Адукацыйныя платформы з’яўляюцца вельмі карыснымі не толькі як інструмент самаадукацыі. Універсітэцкі выкладчык знойдзе там невычэрпную крыніцу дадатковых матэрыялаў да заняткаў, натхненне для распрацоўкі новых спосабаў арганізацыі і падачы звестак, кантролю ведаў. Да самастойнай працы з адукацыйнымі платформамі можна і варта заклікаць студэнтаў: гэта актывізуе іх творчую дзейнасць, дазволіць ім пазнаёміцца з актуальнымі распрацоўкамі ў сферы і дапаможа ўбачыць разгледжаныя на занятках праблемы ў сусветным кантэксце, заахвоціць да вывучэння новых літаратурных крыніц, у тым ліку на іншых мовах. На пачатку кожнага курса платформа прапаноўвае ўсім прадставіцца і нешта пра сябе расказаць; звычайна, сярод удзельнікаў вялікі працэнт непасрэдных працаўнікоў сферы – так можна пазнаёміцца з спецыялістамі ў іншых краінах і нават наладзіць міжнароднае супрацоўніцтва. А досвед узаемадзеяння з платформай у якасці карыстальніка прыдасца падчас распрацоўкі ўласных дыстанцыйных курсаў і ўдасканалення праграм дысцыпліны для студэнтаў усіх форм навучання.